081586
127940

НАШАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 п. 6 (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць тры разы у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 9000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на 4 стрніцы 600 мк. за радок петиту ў 1 шпальт.

№ 1 | Серада 30-га траўня 1923 г. | Год I.

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ У БЕЛАСТОКУ

(Ад уласнага карэспандэнта)

39787

Другі дзень.

Паседжаньне адчыняецца ў 10 гадз. 15 мін.

Аўгеня Матэйчук.

Даныя акту абвінавачаньня:
Знойдзена ў часе вобыску:
1) *Пустая* каробка па 25 рэвальвэрных патронаў
2) 2 алфавітных сьпіскі афіцэраў з гадамі нараджэньня і азначэньнем „przydziału"
3) Картка з надпісам пабеларуску: „№ 15 у Штаб IV групы з плянам працы на 19/II."
4) Пісулька ад 22—I—1922 г. Гэрмача Шыманюка да Веры Маслоўскай, паведамляючая аб ягоным прыездзе 30—I—1922 г
5) Пісаная рукою адозва да беларусаў з клічам да аружнага паўстаньня.
6) Лемантар „Зорка" з ключом да шыфру на 42 стар.

Удзел у арганізацыі, па словам сьведкі Ленкевіча, выяўляўся галоўным чынам у тым, што абвінав была кур'ерам арганізацыі, езьдзіла ў Мэрач, прывозіла адтуль загады ў запячатаных канвэртах, грошы, знала шыфр

На пытаньні суда абвінавачаная насамперш заяўляе, што польскай мовы ня ведае і просіць перакладчыка. Да прыбыцьця прысяжнага перакладчыка ролю яго на сябе бярэ абаронца Врублеўскі.

Далей адказываючы, прызнаецца, што брала удзел і працавала ў беларускай арганізацыі Яна—народная вучыцелька, прыехала з Расеі на Бацькаўшчыну, кончыла беларускія курсы, хацела вучыць беларускіх дзетак роднай мове ў роднай школе. Атрымала школу, але школа заразжа была зачынена. „Тады мы з сястрой пашлі ў беларускую арганізацыю",—закончыла яна.

Прадсядацель. Дзеля чаго ў абвінавач. быў сьпісак афіцэраў?

А. Матэйчук. Проста хацела весьці з імі карэспандэнцыю...

Прадс. Дзеля чаго былі беларускія кнігі, лемантар?

А. Мат. Я—беларуская вучыцелька. Кнігі патрэбны для школы.

Прадс. А што на 42 стар. лемантара „Зорка" быў шыфр, абвінавачаная гэта ведае?

А. Мат. Не.

Абвінавачаная далей паказывае, што ў арганізацыі выпаўняла даручэньні сястры—Веры Маслоўскай. Два разы езьдзіла да Ленкевіча, атрымлівала ад яго два разы грошы на работу. Як папала да яе адозва—не памятае. Карталюшка знойдзена не ў яе. Ленкевіча добра знае. Аб Грыгасе даведалася толькі цяпер, раней яго ня знала.

На пытаньне абаронцы Бабянскага, пры якіх абставінах паступіла ў арганізацыю, аб'ясьняе, што была зрыштавана зусім не за удзел у арганізацыі, а за адкрыцьцё без дазволу ўладаў беларускай школы. Урад не даваў магчымасьці разьвівацца нашай культуры. Дабіваючыся сабе школы, езьдзіла ў Дунілавічы у Несьвіж і др. мейсцы, але нічога не дабілася. Тады—зварочываясь да пракурора—я, па прапазыцыі сястры—ўвайшла ў арганізацыю.

Прадс. Значыцца абвінавачаная толькі была арганізацыі, нікога не вербавала ў яе сама, ня езьдзіла ў Літву, Мэрач?

А. Мат. Не.

Пракурор. Як-жа згадзіць з гэтым паказаньні абвінав у судзебнага сьледавацеля?

А. Мат. Я нічога гэтага не гаварыла, а сьледавацель запісаў няправільна.

Кастусь Матэйчук.

Стрэдні брат сёстраў Аўгені і Веры, мянюшка „Крылаты", харунжы расейскай арміі.

Даныя акту абвінавачаньня:
Пры вобыску знойдзена:
1) Фатаграфія Хмары-Разумовіча ў форме літоўскага афіцэра з надпісам у беларускай мове: „На добрую памяць Крылатаму ад Хмары 19—I—22".
2) Загады Хмары № 1 і № 2.
3) Расьпіска на беларускай мове гэткага зьместу: „Атрымаў ад Мурашкі 50 за правоз з Доржэлі да Пожэча 12/I—22 г. Казімера Мішкінаса". (Расьпіска *без подпісу* атрымаўшага!...)
4) Карталюшка з надпісам пабеларуску: „Станцыя Марцíканцы, вёс. Доржэлі, Грыгас, сястр. Вера, Сякера Веры".
5) Картка, вырваная з сшытка, запісаная шыфрам і аддзельнымі беларускімі словамі.
6) Некалькі беларускіх брашур.
7) Узор рапорту аб састаяньні партызанаў, іх узбраеньні, патронаў.

На паліцэйскім дапросе К. Матэйчук пад страхам прызнаў сябе вінаватым у прыналежнасьці да арганізацыі, ня прыймаючы ў ёй чыннага удзелу. У судзебнага сьледавацеля вінойным сябе не прызнаў: да арганізацыі належаў, але аб яе меце—аружным паўстаньні ня ведаў; лічыў, што яна будзе дабівацца паляпшэньня быту беларускага народу легальнымі срэдствамі.

У адказ на пытаньне суду Матэйчук заявіў, што да арганізацыі не належаў, хоць ведаў аб ёй ад Маслоўскай.

Пракурор адзначае супярэчнасьць паказаньняў абвінавачанага на судзе і ў судзебнага сьледавацеля

К. Матэйчук. Сьледавацель ня пытаў мяне, а проста сьпісаў усё, што было напісана ў пратаколе дэфэнзывы. А на дазнаньні мне пагражалі: „Вы—брат Маслоўскай і, значыцца павінны былі належаць да арганізацыі"; пасьля напісалі і прымусілі падпісацца. Я ня знаю польскай мовы і падпісаў. Сьледавацель так-сама сказаў падпісаць, я падпісаў.

Прад. Значыцца, там напісана неправільна.

К. Мат. Неправільна.

На пытаньне аб знойдзеных у абвінавачанага паперах і дакумэнтах, выясьняе, што ўсё гэта не ягоныя рэчы, а Маслоўскай, што відаць хаця-б з „расьпіскі": грошы атрыманы ад Мурашкі. У другіх так-сама ўспамінаецца імя Маслоўскай.

Андрэй Каляда.

Даныя акту абвінавачаньня:

А. Каляда—стораж праваслаўнай царквы ў Саколцы. Адмаўляецца ў удзеле ў арганізацыі. Паказаў, што запісаў яго ў арганізацыю проціў яго волі б. псаломшчык гэтай-жа царквы Жамойда. Арганізатарам быў, па словам Жамойды, Аляксандар Гораш, які пасьвяціў абвінавачанага ў мэты арганізацыі

Ленкевіч падцьверджае прыналежнасьць Каляды да арганізацыі Хмары.

На пытаньне Суда паўтарае, што не належыць да арганізацыі. Гаварыў аб ёй, прапанаваў уступіць у яе Жамойда, які працуе ў ёй з 1919 г. Абвінавачаны баяўся арышту, але Жамойда сказаў, што Польшча будзе тут не больш году, а пасьля, напэўна-ж, зводьняць усіх арыштаваных.

Прад Адкуль ішлі грошы?

Каляда. З штабу IV групы.

Прад. Што гэта за група? Хто на чале яе? Хто належаў да арганізацыі? Адкуль было аружжа?

Каляда Гаварылі, што Ленкевіч начальнік. Ленкевіч гаварыў, што ёсьць арганізацыя, каб ня нішчылі лясоў, прасіў увайсьці ў склад яе, запісаў нас і паехаў заграніцу.

Прад. Куды?

Каляда. Ня ведаю,—мусіць у Коўню. Адтуль прывёз 109 ці 119 тысяч марак, але грошай не аддаў арганізацыі, а абяцаў даць з тых, што прышлюць яму з Амэрыкі. Езьдзіў з Горашам. Гораш гаварыў, што хутка будзе аружнае паўстаньне.

Прад Калі Гораш спадзеваўся паўстаньня?

Каляда. Ен казаў, што немцы і беларусы прыдуць праз месяц.

Прад. Хто яшчэ належыў да арганізацыі?

Каляда. Ня ведаю. Але А. Матэйчук казала, што Ленкевіч езьдзіў заграніцу і Ленкевіч прывёз адтуль грошы, адзежу і аружжа.

Прад. Значыцца абвінавачанага запісалі ў арганізацыю?

Каляда. Але-ж, не чакаючы маей згоды.

Судзьдзя Здроевскі Абвінавачаны знаў Парука Аляксандра?

Каляда. Чуў, што Парук А—р прывозіў ні то з Горадні, ні то з Варшавы, па яго словам грошы, аддаваў іх брату і другім; гаварыў, што гэтыя грошы—ад вучыцялёў. Але ў вучыцялёў не магло быць нямецкіх марак.

С. Здроевскі. Астроўскага абвінавачаны знаў?

Каляда. Астроўскі так-сама атрымліваў ад Парука грошы.

С. Здр. З Жабінскім спатыкаліся?

Каляда. Жабінскі казаў, што арганізацыя мае нацыянальны характар, але на Пражскім зьезьдзе гаварылі аб тым, што гэтыя землі не застануцца пад Польшчай і будуць зьвернуты Расеі.

С. Здроевскі. Ці ня лічыць абвінавачаны, што дом Грыгаса быў пунктам каля польска-літоўскай граніцы дзеля спатканьня загаворшчыкаў пераеджджаўшых граніцу?

Каляда. Не.

С. Здр. Аб Баранаве абвінавачаны ведае?

Каляда. Жонка Трыпуза пры спатканьні ў вастрозе, казала, што ў Горадні па пачыну Баранава зроблена арганізацыя, ў якой прыймаюць удзел якісь ці дзьве вучыцелькі.

С Здр. Аб дзейнасьці Якавюка знаеце?

Каляда. Ня чуў

Пасьля Каляда абгаварвае яшчэ шэраг абвінавачаных: К.Матэйчука, Аўг.Матэйчук і др., з якімі, быццам, меў гутарку і аб якіх ні словам ня ўспамінае на дапросе судзеб. следаваціеля.

Абаронца Бабянскі. Скажэце, абвінавачаны, калі ў вас былі ўсе гэтыя гутаркі: ў вастрозе, ці да вашага арышту? ў гэтым годзе, ці ў леташнім?

Каляда (прагаварыўшыся). Так, у гэтым годзе.

Пракурор (пытаецца, каб памагчы выйсьці Калядзе з прыкрага становішча). Ці гэтыя размовы мелі мейсца ў вастрозе, ці раней?

Прадс. устанаўляе, што апошнія размовы мела мейсца ў вастрозе.

(Для паясьненьня трэба адзначыць цяпер усё, што пасьля ўстаноўлена, было штоў вастрозе. А Каляда, быўш сакратаром паліцыі ўрасейскія часы і няўпынна падаваўшы заявы, каб паступіць у польскую,—раскаяўся і выпаўняў у вастрозе сярод арыштаваных пэўныя даручэньні паліцыі).

Абар. Славінскі пратэстуе, проціў таго, што суд дапрашывае абвін. Каляду, не як абвінавачанага, а як сьведку: не аб ім самым, не аб яго ўдзеле ў арганізацыі, а аб выключна аб другіх. Абарона дамагаецца дазволіць і ей задаваць абвін. Калядзе пытаньні, як сьведцы. Ня трэба забываць, што абвінав. Каляда ўжо на волі, а тыя, каго ён абгаварывае сядзяць пад арыштам. Магчыма, што Каляда проста хлусіць Трэба даць магчымасьць спраўдзіць яго паказаньні.

Прадс. абяцае даць потым слова тым абвінавачаным, аб якіх гаворыць Каляда, для выясьненьняў.

Абар. Славінскі пратэстуе і просіць запісаць у пратакол яго заяву. Ен ня мае ніякіх срэдстваў прыняволіць суд, але прымушаны заставіць у пратаколе точны сьлед яго справядлівага пратэсту.

Прад. прапануе выказацца пракурору.

Пракурор кажа, што закон не забараняе абвінавачаным казаць на судзе праўду аб сваіх спаўабвінавачаных.

Абарон. Славінскі абураецца проціў такога перакручываньня сэнсу ягонай заявы праз пракурора

Абар. Врублеўскі прапануе суду, згодна з практыкай быўш. Расейскага Сэнату, дазволіць абвінавачаным праз абаронцаў альбо прадседацеля пытаньні ня толькі сьведкам, але і спаўабвінавачаным.

Пракурор не пратэстуе і прадседацель дае магчымасьць усім тым абвінавачаным, якіх „тапіў" у сваіх *новых*, не дадзеных ні на сьледзтве, ні на дапросе паказаньнях Каляда,—*зараз-жа* праз пытаньні, а ня потым—праз паясьненьні—выясьніць вартасьць паказаньняў ня столькі „спаўабві-

навачнага", сколькі „спаўабвіняючанага" Андрэя Каляды.

Ал. Парук пытаецца ў Каляды, якія грошы ён прывозіў і раздаваў і ці бачыў ён гэтую раздачу сам.

А. Каляда гаворыць, што сам ён ня ведае, але чуў ад брата Парука.

А. Парук адкідае ўсё, што гаварыў пра яго Каляда.

К. Матэйчук. Адкуль Каляда ведае пра грошы, якія, быццам, я прывазіў?

А. Каляда Парук гаварыў, што і ты, Матэйчук, езьдзіў і прывозіў грошы з-за граніцы і ад вучыцялёў.

К. Матэйчук. Усё гэта няпраўда.

Аўг. Матэйчук. Адуль ведае Каляда, што я езьдзіла за граніцу?

А. Каляда. Сама Матэйчук гаварыла.

Аўг. Мат. Калі і з кім я езьдзіла за граніцу?

А. Каляда. Сама Матэйчук гаварыла, што езьдзіла даведацца, ці прывёз Ленкевіч грошы; казала, што Ленкевіч прывёз адзежу з Штабу.

Аўг. Мат. Калі гэта было?

А. Каляда. Не памятаю.

Аўг. Мат. Калі паміж намі былі гэтыя размовы?

А. Каляда не адказывае.

Абар. Славінскі хоча высьветліць, ці былі запісаны на пачатковым сьледзтве ўсе гэтыя размовы ці яны мелі мейсца пасьля паказаньняў Каляды ў судзебнага сьледаваццеля.

Пракурор кажа, што *бадай* (!) усё ёсьць у пратаколе пачатковага сьледзтва.

Абар. Славінскі заяўляе, што гэта няпраўда: там аб гэтых размовах нічагусенька няма.

Так і засталося невыясьненым гэтае пытаньне. Выявілася толькі асоба і роля абвін. Андрэя Каляды, аб чым яшчэ пабачым далей.

Грыгор Каляда.

Двойчы ўспамінаецца ў знойдзеных у „канцэлярыі" Шыманюка дакумэнтах:

1) у сьпіску прынятых на пэнсыю, як афіцэр для лучнасьці і

2) на так званай „lišcie płacy" «служачых отд. Ііt. g за месяц люты 1922 г.» пад мянюшкай Барысаў Грыгор łącznik. 600.

Па словах сьведкі Шыгаловіча (не зьявіўся), прыймаўшага удзёл у арганізацыі, а пасьля выдаўшага яе паліцыі, Грыгор Каляда, завэрбованы ў арганізацыю праз Станкевіча, езьдзіў у штаб V групы, дзе Разумовіч-Хмара пагрозамі заставіў яго паступіць у партызанскі атрад; прывёз з Мэрача 200 000 мар. польск і дзьве „машыны для ўзрыву мастоў".

Абвінавачаны Лукашук паказаў, што Грыг. Каляда гаварыў яму ў студзені 1922 г. аб тым, што вясною разгарыцца паўстаньне і угаварываў увайсьці ў арганізацыю

Абвінавачаны Грыгор Каляда ня прызнае сябе вінаватым, удзелу ў арганізацыі ня браў; сярэдняга брата свайго Лукашука не намаўляў; ня ведае нават дзе Мэрач; аб машынах для ўзрыву мастоў нічога ня чуў.

Грыгор Астроускі.

Жыхар м. Крынні, Горадзенскага пав.

Абвінавачаньне цалком збудавана па паказаньнях правакатара Ленкевіча, па славах якога Парук пазнаеміў яго з Астроўскім у палове лютага 1922 г. у сябе ў школе ў Горадні, адракамандаваўшыся, як начальнік району ў Крынках. Астроўскі павінен быў арганізаваць атрад, які, быццам, меў заданьне з пачаткам паўстаньня заняць Саколку. Правакатар Міхнюк паказаў, што сам Станкевіч заўсёды радзіўся з Астроўскім.

На дапросе ў паліцыі Астроўскі прызнаўся, што належыць да арганізацыі і атрымаў, як сябра яе, ад А. Парука 5.000 м. п.

У судзебнага сьледавацеля Астроўскі гэтыя свае паказаньні адкінуў. Прышоўшы 19 лютага 1922 г. да Парука і заставўшы ў яго незнаёмага яму да таго часу Ленкевіча, Астроўскі пазваў у другі пакой Парука і папрасіў пазычыць яму 1.000 мар. Парук даў яму 5.000, але папрасіў прызнаць сябе перад Ленкевічам сябрам арганізацыі і сказаць, што ў Крынках справа йдзе добра, бо іначай Ленкевіч скажа ў Мэрачы, што Парук нічога ня робіць у арганізацыі. Маючы патрэбу ў грошах, Астроўскі згадзіўся сказаць гэта.

Дапрошаны на судзе Астроўскі заявіў, што ў арганізацыі удзелу ня браў і зьяўляецца ахвярай абгавору Грошы ўзятыя ў Парука пазычыў і аддаў яму пры першай магчымасьці.

Мацей Грыгас.

Ж. в. Даўжэлі, гм. Марцінканцы, Троцкага п. літовец.

Даныя акту абвінавачаньня:

Дзейны сябра арганізацыі ў ролі перавошчыка праз літоўскую граніцу загаворшчыкаў, якія езьдзілі туды і назад.

Ленкевіч і шэраг абвінавачаных, як Сьцяпан Жабінскі, А. Шыманюк (растрэляны), Яз. Захарчук, Андрасюк паказалі на сьледзтве, што Грыгас перавозіў іх за плату праз граніцу, хаваў агітацыйную літэратуру.

У часе вобыску знойдзена:

1) 4 квітанцыі ўсяго на суму 25.000 м. п. за правоз праз граніцу над рожнымі мянюшкамі сябраў арганізацыі

2) 1 беларуская брашура, 4 адозвы ўраду Ластоўскага з прычыны выбараў у Віленскі Сойм з таго „складу" літэратуры, аб якім на дапросе паказаў Андрасюк.

На пытаньні суда Грыгас адказаў, што вінаватым сябе ня лічыць да арганізацыі не належаў, а, жывучы ў 10 верстах ад граніцы, займаўся перавозам праз яе розных асоб, маючы на мэце толькі камэрцыйную выгаду. Квіткі выдаваў па просьбе тых асоб, якім па іх словах, яны былі патрэбны для рахункаў, яны называлі сябе кооператарамі і інш

Пракурор. Ці езьдзілі ў Мэрач?

Грыгас. Езьдзіў на рынак.

Прадс. Значыцца абвінавачанаму не вядомы былі мэты арганізацыі, якой ён рабіў услугі сваімі перавозкамі?

Грыгас. Не

Прадс. Ці перавозіў праз граніцу Веру Маслоўскую?

Грыгас. Два разы.

Прадс. А Аўгеню Матэйчук?

Грыгас Ні разу.

Прадс. А Жабінскага?

Грыгас. Адзін раз

Прадс. А Якавюка?

Грыгас. Не

На пытаньне абаронцы Славінскага абвін. Грыгас кажа, што перавозіў шмат пасажыраў з багажом на абодва бакі з Польшчы ў Літву і з Літвы ў Польшчу часта з багажом на вазох што тлумачыцца вялікімі кірмашамі ў Мэрачы, куды шмат езьдзіла з польскага боку граніцы Прозьвішчаў пасажыраў ня пытаўся. Зьместу брашуры ня ведае — знайшоў на вуліцы.

Аляксандар Гораш.

Крамнік у Саколцы, бyўшы афіцэр расейскай арміі.

Абвінавачываецца на падставе паказаньняў правакатара Ленкевіча, Андрэя Каляды і Жамойды.

Па словам Ленкевіча Гораш у сваей крамны, гандлюючы гарэлкай, вэрбаваў праваслаўных беларусаў прызыўнога веку і вёў агітацыю сярод жаўнераў польскай арміі, прыходзіўшых да яго крамкі, каб яны пераходзілі на літоўскі бок і паступалі там у беларускія палкі. Езьдзіў у Мэрач і прывёз адтуль 4 рэвальвэры і грошы на агітацыю.

Андр. Каляда паказаў, што Гораш часта езьдзіў у Мэрач і прывозіў грошы; паказваў яму, Калядзе, 2 загады з даручэньнем зьбіраць весткі аб аружных сілах Польшчы.

Жамойда паказаў, што Гораш нагаварваў яго ўвайсьці ў арганізацыю і прынёс яму 2 загады Хмары, шыфр і ключ да яго.

Пры вобыску ў Гораша знойдзены рэвальвэр сыст. Para bellum з 19 патронамі і выдраны з кніжкі алфавітны сьпіс польскіх афіцэраў на лт. Н.

На пытаньні суда Гораш адказаў, што да арганізацыі не належаў. У Мэрач ня езьдзіў, аб рэвальвэры сам заявіў паліцыі, рэвальвэр у яго даўно; 16 гадоў быў афіцэрам расейскай арміі і 2 гады польска-беларускай

Маслоўская запраўды прапанавала яму ўвайсьці ў арганізацыю, але ён адмовіўся. Жамойду не намаўляў.

На пытаньне пракурора адказаў, што занадта стары і мае вялікі досьлед, каб незнаёмых яму жаўнераў, што прыходзяць да яго ў крамку за пакупкамі, намаўляць да дэзэртырства, рызыкуючы ўсім сваім дабрабытам і сям'ёю. Рабіць усё гэтае пад пільнай увагай польскай улады было б занадта небясьпечным.

Аляксандар Станкевіч (Пугачоу).

Акт абвінавачаньня лічыць Станкевіча адным з галоўных дзеячоў арганізацыі Дзейнасьць яго высьветлена агентам Міхнюком, увайшоўшым у арганізацыю пад мянюшкай „Пэрсіянаў".

У часе вобыску знойдзена:

1) Karta pozwolenia на імя Васілеўскага, якога Станкевіч завэрбаваў у беларускі полк у Літве.

2) Карта Горадзеншчыны „Нямец. Ген. Шт."(?) з адзначанымі вёскамі і мястэчкамі.

3) Некалькі адозваў Хмары, прызываючых беларусаў да паўстаньня проціў Польшчы.

4) Інструкцыя для пяхоты, пісаная ў беларускай мове.

5) Надрукованая на шапірографе інструкцыя для начальнікаў аддзелаў.

6) Пісаная па-расейску загаворшчыкам Захарам Леваненя („Лебедзеў") запіска, ў якой былі весткі аб меўшай быць мабілізацыі і аб мосьце цераз Сьвіслач, з прапазыцыяй прыбыць у Бераставіцы.

7) Пісьмо Станкевіча Уладзіміру Шэдка з даручэньнем закончыць да 20—IV арганізацыю Галынскай гміны і партызанскага атраду. У пісьме рэзкія сказы адносна да палякаў і указаньне на прыналежнасьць пісаўшага да Р. К. П. бальшавікоў.

8) Пісьмо да Міхнюка—„Пэрсіянава" „Пугачова" (мянюшка Станкевіча), ў якім апошні просіць прыстаўленага да яго правакатара „як найхутчэй закончыць арганізацыю Індурскага району", начальнікам якога быў Міхнюк, паведамляючы, што „за аружжам пасланы чалавек".

9) Рэвальвэр новы сыст. Para bellum з 11 патронамі, 10 патронаў да стрэльбы, лента ад кулямёту.

Сьведка Уладз. Шэдка паказаў, што Станкевіч напісаў яму пісьмо з прапазыцыяй увайсьці ў баявую арганізацыю. Сьв. Рудзян паказаў, што Станкевіч гаварыў яму пра арганізацыю, аб 2 захаваных кулямётах. Сьведка Шыгаловіч (агент-правакатар) паказаў, што Станкевіч яго і яшчэ некалькі маладых чалавек прызыўнага веку асабіста адвёз у Штаб IV групы.

На пытаньне прадседацеля адказывае, што прызнае свой удзел у арганізацыі, але хоча выясьніць прычыны, заставіўшыя яго зрабіць гэта. У Расеі служыў у „Пленбежэ". Там пасьля Рыскага трактату было шмат агентаў Польскага Ураду, якія угаварывалі ураджэнцаў зямлю, што зьвышлі да Польшчы, вяртуцца на Бацькаўшчыну, сулячы ўсялякія абяцанкі. Паверыўшы гэтым агентам, абвінавачаны вярнуўся ў сваю вёску Крынкі Горадзенскай зямлі. Але тут усё аказалася іначай, чым абяцалі агенты па рэпатрыяцыі. Абяцалі дапамогу на адбудову зруйнаванай гаспадаркі, але ў гэтай галіне нічагусенька ня зроблена. Рэпатрыянты беларусы жывуць у зямлянках, як зьвяры, дзеці мруць з голаду і холаду.

За заяву ў гміне бяруць апошнія грошы, атрыманыя ад прадажы астаткаў маемасьці, а вынікам усяго гэтага—адмовы ў просьбах. Адмаўляючы казалі: невядома ці належыць Горадзеншчына да Польшчы, ці не і ці будзе належаць на пэўна ня ведаем. Як выясьніцца..

Пасьля прышлі падаткі, даніны, якія сьцягівалі, прадаючы апошняе. Просьбы не памагалі... На хаўтуры ня было...

Прадс. Просіць гаварыць карацей і бліжэй трымацца пытаньня: чаму ўвайшоў у арганізацыю.

Станкевіч Я і хачу выясьніць, чаму ўвайшоў у арганізацыю. Зіма была жудасная. Дзеці і кабеты замерзалі ў зямлянках, з холаду і голаду ў нас памёрла 405 чалавек...

А што польская, ўлада рабіла з нашымі школамі. Іх зачынялі, не давалі дзецям вучыцца на роднай мове...

Прадс. зноў зварочывае ўвагу, што гэта не мае адносін да ўступленьня ў арганізацыю.

Абаронца Станкевіча генарал *Бабянскі* заяўляе, што ўсе гэта проста адносіцца да прычын, папхнуўшых абвінавачанага на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Незадавальненьне праз уладу культурна-прасьветных і эканамічных патрэбаў беларускай людмасьці, акурат і выклікала ўсю гэтую „пітаку" і папхнула найбольш актыўныя элемэнты на іншыя мэтады бараньбы.

Абв. Станкевіч. Польскія вучыцялі выганялі беларускіх дзетак, якія хацелі вучыцца роднай мове...

Прадс. прапануе абвін. адказываць лепш на пытаньні суда.

Станк. адмаўляецца адказываць на пытаньні і пратэстуе проціў таго, што яму не дазваляюць даць свае аб'ясьненьні

Пракурор ссылаецца на закон, як забараняе рабіць з лаўкі падсудных на судзе трыбуну для антыдзяржаўнай агітацыі, кілкаць да зьнявагі ўлады. Абвінавачаны карыстаецца судом для прапаганды камуністычных ідэй.

Абар. ген. Бабянскі устанаўляе, што ў словах абвін. Станкевіча ніякай камуністычнай прапаганды няма і просіць суд даць абвін. магчымасьць высказацца да канца.

Абар Врублеўскі дамагаецца даць свабоду слова абвінавачанаму з пункту гледжаньня чыста юрыдычнага. Трэба даць магчымасьць падсуднаму выясьніць суду ўнутраную суб'ектыўную старану праступленьня, калі яно мела мейсца. Практыка расейскага сэнату заўсёды стаяла на гэтым пункце гледжаньня. У расейскім судзе царскага часу на ўсіх палітычных працэсах, калі судзілі нават забойцаў самых высакапастаўленых асоб, заўсёды давалі падсудным высьвятляць да канца матывы праступленьня. Нават такі прадседацель, як Крашэнінікаў, даваў магчымасьць абвінав. высказацца, ня лічучы гэтае выясьненьне суб'ектыўнага боку праступленьня агітацыяй З гэтага чыста—юрыдычнага пункту гледжаньня абар. дамагаецца абвінавачанаму свабоды слова.

Пракурор энэргічна пратэстуе, падкрэсьліваючы, што дрэннага прыкладу з расейскіх судоў браць ня трэба. Прамова Станкевіча—тыпічна-агітацыйная прамова камуністычнага ўзору і яму застаецца толькі дзівіцца, што ў польскім судзе прадстаўнікі польскай адвакатуры выступаюць на абарону праціваўрадавай антыпольскай прапаганды, недапусьцімай для запраўднага польскага патрыота.

Абар Міцкевіч горача протэстуе проціў слоў пракур. Мы, прадстаўнікі польскай адвокатуры, магчыма, ня горшыя патрыоты, чым пракурор, але мы аб патрыятызме будзем гаварыць у другім мейсцы. „Мы прышлі ў польскі суд выясьніць судовую праўду, а не сачыць за патрыятызьмам і польскасьцю адзін другога". Просіць суд даць магчымасьць абвінавачанаму свабодна выясніць суду матывы сваіх паступкаў.

Абар. Грушкевіч далучаецца да пратэсту проціў слоў пракурора. Польскі патрыятызм, як і ўсякі іншы, ня толькі не забараняе, але проста вымагае паказываць на недастаткі і непарадкі ў краі. Абвін. Станкевіч гаворыць проціў непарадкаў у Польшчы, але ня проціў Польшчы.

Абар. Славінскі з прысутнай яму дасьціпнай ірoніяй замячае, што яго, як абаронцу па назначэньні ад суду, надта трывожаць і абражаюць падазрэньні ў сымпатыі да камуністычнай прапаганды. Дзеля гэтага ён быў-бы рад, каб прадседацель сьцвердзіў, што запраўды ніякай камуністычнай агітацыі ня было.

На ўсе гэтыя заявы *пракурор* маўчыць і *прадседацель* дазваляе Станкевічу гаварыць далей.

Станкевіч гаворыць аб даўнасьці беларускай культуры і пісьменнасьці, якая старэй за польскую, аб тым, што раз прабудзіўшыся народ ня можна задушыць, што нацыянальная сьвядомасьць беларусаў ня будзе зьнішчожана, што ён вярнуўся на Бацькаўшчыну памагчы роднаму народу змагацца за свае правы, каб і, калі барацьба пашла ня тым шляхам, якім магла-б ісьці пры нармальных варунках, дык у гэтым вінавата польская ўлада, а не беларускі народ.

На пытаньне пракурора прызнаецца, што рэвальвэр у яго быў знойдзены, але большасьць сваіх паказаньняў у сьледаваццеля адкідае. За падставу апошніх быў паложаны пратакол паліцэйскага дазнаньня. Абвін. падробна раскавае, як зроблены апошні. Ен быў арыштованы цэлым атрадам пяхоты на чале з вывядоўцамі. Пры арышце яго на мейсцы абабілі да паўсмерці . . . білі па твары і па чым папала . . . Паўжывога адвязьлі да пастарунку. Але быў прыказ везьці далей да Беластоку.

Абвін. падробна адзначае далейшыя пабоі і зьдзекі пры дапросе. Тут і гумовыя палкі і шэраг другіх – вядомых нам па царскай практыцы – прылад . . . Абвін. пратэстуе проціў таго, што ў пратаколе судз. сьледаваццеля папала ня толькі тое, чаго ён ня гаварыў, але і тое. што ён асабліва адкідаў. Падпісаў гатовы пратакол, баючыся далейшых пабояў і зьдзекаў.

Пракурор. Ці абвінавачаны належыць да камуністычнай партыі?

Станк. Не належаў у Расеі, не належу і ў Польшчы.

Абв. Захар Леваненя.

(Лебедзеў) жых. в. Копынцы Горадзенскага пав.

Удзел у арганізацыі акт абвінавачаньня ўстанаўляе на падставе вышэй прыведзенага пісьма Станкевіча і паказаньняў апошняга.

На пытаньні суда абвін. адказвае, што вінаватым сябе ня лічыць; што запраўды пісаў пісьмо да Станкевіча ў Бераставіцу ў засаду, каб выдаць паліцыі.

Карнэль Масальскі.

Жых. в. Грабавец, Бельскага пав.

Прозьвішча Масальскага зьмешчана ў сьпісу сябраў арганізацыі, знойдзеным у „крыюўцэ" банды Скамароха: „Масальскі—25.000 м. п., за прадукты 5 000".

У памешканьні суда Масальскага па паказаньню сьвед. Краўчука, Шыманюк выплаціў на пачатку красавіка пэнсію сябрам арганізацыі ў Грабаўцы.

На пытаньне суда адмаўляецца ў удзеле ў арганізацыі. Шыманюка не знае, грошай не атрымліваў. Як папаў у сьпісак арганізацыі ня ведае.

Аляксандар Андрасюк.

(Сердобскі) ж. в. Чэхі. Бельскага пав.

Прозьвішча абвін. зьмешчаны ў „сьпіску в Чэхі", знойдзеным у Скамароха. Аб удзеле ў арганізацыі для лучнасьці паміж арганізацыяй і Штабам IV групы паказаў абвін. Сымон Мацэевіч. Езьдзіў з Андр. Тамашуком у Даржэлі да Грыгаса.

Абвін. Андрасюк удзел у арганізацыі адкідае. На пытаньне прадс. чаму ён прызнаўся на дапросе у сьледаваццеля, Андрасюк заяўляе, што сьледаваццелю ён не гаварыў нічога, а як папала ў пратакол ягонае паказаньне ён ня ведае. На ўсе пытаньні адказывае адмоўна.

(Далей будзе).

Першы палітычны працэс беларусаў.

Барацьба проціў белар. нацыянальнай ідэі.

Беластоцкі працэс беларусаў—першы палітычны працэс. зьвязаны з ідэяй свабоднай незалежнай Беларусі.

Да гэтага часу прадмет ідэолёгічных лятуценьняў, безнадзейных міжнародных мэмарыялаў, палітычных дэкляpацый і палітычных даносаў, публіцыстычных атак і адміністратыўнай расправы, ідэя беларускай дзяржаўнай незалежнасьці першы раз становіцца прадметам гласнага судовага працэсу.

У першы раз дзяржаўная ўлада, ў асобе публічнага абвінаваццеля, моцна, хоць і тэндэнцыйна, ува ўсякім выпадку шмат мацней, чым нават самі энтузыясты гэтай ідэі сярод абвінавачаных,—зьвязывае гэтую ідэю з аружным народным паўстаньнем... у страха вочы вялікія... у трывожнага сумленьня —яшчэ большыя...

У першы раз дзяржаўная ўлада, і —першая польская дзяржаўная ўлада — ужыла дзеля барацьбы з гэтай ідэяй усю сілу свайго магутнага паліцэйскага апарату, ўсе срэдствы розыску і нясумленнага падходу, выпрацаваныя шматгадовым досьледам барацьбы з народнымі рухамі. ўзятымі ў спадчыну Польскай Рэспублікай ад вялікіх антынародных манархій, падзяліўшых калісь-ці самую Польшчу...

Але правы былі Масло ўская, Баранаў, Жабінскі (ў сваім пісьме з вастрогу), калі казалі, што рэпрэсыямі і тэрорам нельга змагацца з народным рухам, што ідэю нельга пасадзіць у вастрог, у каменную клетку...

Адна з самых магутных і жыцьцёвых ідэй атрымала асаблівую сілу і энэргію ў крывавай купелі сусьветнай вайны — гэта ідэя нацыянальнай свабоды і незалежнасьці т. зв. „малых народаў".

У выніку вялікай вайны, праўду сказаўшы, не закончанай яшчэ і дагэтуль, ня ўсе народы атрымалі тое, што гэткія яе ідэалёгі, як Вільсон, ставілі загадненьнем Вялікай Коаліцыі.

Беларускі народ не атрымаў таго, што абяцалі пераможцы ўсім праліваўшым кроў „за волю ўсяго сьвету" — што атрымаў польскі народ.

Яшчэ так нядаўна ў працэсе супольнага змаганьня абодвы народы — польскі і беларускі — стаялі побач адзін з другім, як „роўны з роўным і вольны з вольным", абодвы толькі што звольніўшыяся з пад супольнага рабства. Але хутка, на жаль, народы першай гістарычнай чаргі прайшлі ў храм свабоды, а народы, мусіць, застаўленыя гісторыяй „на заўтра", ня толькі засталіся за дзьвярыма храму, але былі разрэзанымі жыўцом на часткі.

Вось той агульны і шырокі гістарычны фон, на якім зрабіўся магчымым беларускі працэс і які зрабіў выдатным усе яго асаблівыя рыскі.

Трагічнае для народу—абвінаваццеля у тым, што ён змушаны судзіць, як праступніцу проціў яго дзяржаўнасьці, тую самую ідэю нацыянальнага вызваленьня, на якой выхавалася столькі яго пакаленьняў, якая ў яго нацыянальным пантэоне стварыла столькі герояў, на яго нацыянальным аўтары столькі мучанікоў... Змушаны судзіць і ўкрыжовываць тую самую ідэю, за якую паўтары сотні лет быў сам укрыжаваны і якая прывяла польскі народ да яго ўваскрасеньня

Моц беларусаў цяпер не ў матэр'яльных срэдствах, ня ў тых мітычных мільёнах, ня ў тых „узбраеньнях" і выдуманых правакатарамі „складах аружжа" ды „запасах атруты", якіх усёткі не змаглі прынясьці ў суд, як рэчовы доказ,—моц беларуская ў той дзяржаўнай кволасьці, маральным бязьсільлі той гаспадарсьцвеннасьці, якую столькі гадоў энтузыясты польскага нацыянальнага вызваленьня стараліся збудаваць.

Іронія ў тым, што польскі народ, вышаўшы з няволі і сам зрабіўшыся ўладарам нявольнікаў, як бы аддаў ўсю сваю гераічнасьць, зрабіўшайся яму непатрэбнай і рэвалюцыйна-нацыянальную ідэалёгію і энэргію тым народам, якіх судзьбіна аддала пад яго ўладу. Народы гэтыя пачалі той самы шлях, па якому прайшоў і польскі народ.

Для беларускай нацыянальнай ідэі Беласток быў першай гальготай, з якой гэтая ідэя зышла мацней, як была перш,—пройдзе яшчэ глыбей у народныя масы і — шырэй і далей паміж народамі ўсяго сьвету... А колькі-ж балота было выліта на гэтую чыстую ідэю на гэтым працэсе. Як груба абвіненьне сплутывала барацьбістаў беларускага руху з бандытамі. Гэта быў галоўны козыр абвінавачываньня. Як хітра ўсё было скартавана, каб чысты ідэёвы рух, маючы на мэце толькі *арганізацыю народных сіл*, мусіў выpадзіцца ў бандытызм, калі з руху былі выдаўлены ідэёвыя працаўнікі, а астаўлены „скамарохі" ды правакатары.

Але ўсё гэта дармо... Ня фізычнай сілай, не паліцэйскім мастацтвам, ня тактыкай і стратэгіяй агентаў-правакатараў трэба змагацца з усенароднай ідэяй.

Моц яе падцьвердзіў больш чым трэба першы працэс Польскай рэспублікі супроць беларускай нацыянальнай ідэі... Першы, але, як абецалі на гэтым-жа працэсе, не апошні... Яшчэ мае быць у Горадні, Вільні... Што-ж, хай будуць, нам астаецца толькі верыць, што пасьля кожнага з іх ідэя сувэрэннага беларускага народу будзець, выходзіць, як фэнікс з полымя—ачышчанай і мацнейшай.

— СЛУХАЙ! — слабы, ціхі ўжо голас, але неўпынны шаптаў уміраючаму таварышу Джыму. — Ты—гэта рэвалюцыя! Ты—агульная справядлівасьць сьвету, што змагаецца да апошняга на сьмерць і жыцьцё. Ты—людзкасьць, што з воблікам зьвернутым да сьвятла шыбуе да новых мэт, топчучы старое зло! Ты — Хрыстос расьпяты на крыжы! Калі ты не ўстаіш — сьвет ізноў упадзе ў даўнейшую цемрадзь—можа на векі. Ты павінен вытрываць Мусіш усё працярпець: і гэтыя мукі і ўсе іншыя. Усё мусіш перацярпець, перанясьці, усё, што трэба. Табе нельга ўступаць!

А. Сінклер — з твору „Джым Гігінс"

Жачкы сьветагляд.

Насьвячаецца В. М—скай.

I.

Ноч падзяліла.. Сьвятач дзе? Жыва!
Шаўгаем... склізка... Балота ці кроў?!
Сыкаюць цені... Абоймы.. Туж ліва
дбайце аб волі. Волі!
Хрыпат братоў...
Душаць!!

Людзі ці зьверы?—

Сэрца гвалтоўна б'ецца ў дзьверы,
жалезныя дзьверы жыцьця —
Волі! Волі!
Сьвету-б праменьчык хаця!
Так ня было і ня будзе ніколі!
Ланцуг-спавіяч з адчаю зубамі—
. скрогат. стагнаньне...
Пры катаваньні для мук тамаваньне
робяць сьвятымі славамі:
„Жыві Беларусь — сьвятліца працоўных!"

Ах, колькі-ж ёсьць мук нявымоўных!

II.

Агнем свайей помсты
Мы цемру запалім,
Тугу, безнадзейнасьць
Разьвеем, расплавім.

Агонь у нявольных
Руках судзьдзя строгі:
У попял заменіць
Кайданы, вастрогі.

Агонь не давалі
Багі—ліхадзеі.
Цяпер хай лагво іх
У попял сатлее.

Агонь сонца-бацька,
З агню маць-зямелька,
Агонь вось сусьвету,
Ен сьмерць збавіцелька.

Хай Жыжа укусіць
За карак злой ночы.
А полымя сушыць
Заплаканы вочы.

Агонь ганец гонкі,
Жывучы, чырвоны
Пакажа як скача,
Раскрыўшы заслоны.

Ен музыка помсты.
Пяець і бушуець.
Пылай жа агнісьцей,
Хто скуты начуець.

III.

Настане час, як рэха творчай, спорнай працы
Акордамі атуліць зямлю-маць.
І задрыжыць зямля ў захопленьні юначым
Аркестр касмічны годзі хвальшаваць.

Настане час—аб гэтым кажа мудрасьць краскі,
Пчала мядком пахучым вабіць нас.
Туды нас клічуць сонца, сьпелай нівы ласкі
І змагары за волю—за той час.

Л. Р.

„Важныя падзеі“.

Пад гэткім надпісам, зробленым вялізарнымі літэрамі, расейскія газэты заграніцай зьмяшчаюць кожны дзень весткі, якія нічога вясёлага ня суляць.

Дапаўняючы і без таго трывожныя весткі аб ваенных прыгатаўленьнях Францыі і зьвязаных з ёй Польшчы, Румыніі і др. дзяржаваў, расейскія газэты стаўляюць толькі кропку над і: яны ясна кажуць, проці каго зьбіраецца ваенная навальніца.

„Справа“ вось у чым. Як ведама у Заходняй Эўропе, асабліва-ж у Югаславіі, пачаўся вялікі рух сярод расейскіх эмігрантаў. З Бялграду паказуюць, што тамака творыцца вайсковы цэнтр з вялікімі князямі Мікалаем Мікалаевічам і Кірылам Валадзіміравічам на чале, пры учасьці царскіх генаралаў Гуркі, Врангеля, Сахарава, Кутепава і др. Палітычнае кіраўніцтва знаходзіцца ў Парыжы, дзе гэтымі днямі павінны былі зьехацца в. князь Мікалай Мікалаевіч, ген Юзэфовіч ген. Мільлер і ген. Шатілов каб атрымаць гэтак патрэбныя ім франкі і інструкцыі, у якім мамэнце яны павінны выступіць з дэнікінскімі недабіткамі проці Саюза Социялістычных Савецкіх Рэспублік, што ўзварыўся на руінах імпэрыі расейскіх цароў.

Цікаўна адзначыць яшчэ адно—у істоце сваей вельмі сумнае зьявішча. Ні для кога не сакрэт, што царскія генаралы і вялікія князі ніякае іншае думкі ня маюць, як замест савецкага ладу і фэдэрацыі нацыянальных рэспублік адбудаваць старую Расейскую дзяржаву—„Самодзержавную, единую и неделимую“. Вось жа, ня гледзючы на гэткія агідныя мэты павадыроў процібальшавіцкага руху, пад камандай в. кн. Мікалая Мікалаевіча гуртуюцца ўсе расейскія эміграцкія групы: манархісты, дэмакраты і навет сацыялісты. Як піша парыжская газэта „Маяк“, у Парыжу пачала выходзіць расейская газэта—пад назовам „Руская Газета“, каторая і злучае ўсе названыя групы, стаўляючы за заданьне аб'яднаць усе расейскія эміграцкія элементы дзеля стварэньня адзінага процібальшавіцкага фронту. Што-ж гэта значыць? А значыць гэта, што, калі б „белым“ заграўды ўдалося разьбіць бальшавікоў, дык на другі дзень сярод спадзяваных пераможцаў пачнецца ўзяняцца новая крывавая барацьба, бо ж правыя ніколі не захочуць дзяліцца ўладай з дэмакратамі і соцыялістамі, дый апошнім ня гора сядзець на міністэрскіх крэслах побач з катамі народу, запэцкаўшымі ўжо даўно свае рукі народнай крывёй...

Як бачым так званыя „вялікія падзеі“ нікому нічога вясёлага ня суляць,—хіба толькі тым, хто іх падгатаўляе за францускія франкі!

Ст. Мірскі.

Палітычныя падзеі.

Польшча. Кабінэт Сікорскага не атрымаў даверыя у Сойме. Проці Сікорскага галасавалі: хьена, пяст, украінцы беларусы, жыды і немцы (278 гал.), за Сікорскага: P.P.S. Wyzwolenie, Р і адкалоўшаяся ад Пяста група Домбскага (117 галасоў). Кабінэт Сікорскага падаўся ў адстаўку. Прэзыдэнт адстаўку прыняў і даручыў Вітасу утварэньне новага кабінэту. Вітас прадставіў сьпісак новых міністраў. Усе партфэлі падзелены паміж Хьенай і Пястам. Міністар асьветы—Глобінскі (эндэк), унутр. спраў—Кернік (пяст), загр. спраў—Мар'ян Сэйда (энд.); галоўны зямельны ўрад—Осецкі (пяст.) і г. д.

Беларускія паслы падтрымліваць новага ўраду ня будуць. У пятніцу новы ўрад стане перад Соймам. Група Домбскага абеднала́ся з Wyzwoleniem. Соймавая большасьць. Новы ўрад будзе апірацца на правую большасьць сойму, якая налічвая 225 паслоў разам К.Сh. N. (дубадэкамі), якія ў склад ураду не ўваходзяць.

За апошнія часы ў Польшчы наступіла нейкая эпідэмія кіданьня бомбаў: у Кракаве з (у памешканьні рэктара універсытэту Натэнсона, ў памешканьні „Бунду“ і рэдакцыі жыдоўскай газэты), пасьля ў Лодзі, а нядаўна ў Варшаве ў рэдакцыі розных газэт, у Варшаўскі унівэрсытэт, дзе збурана частка будынку і забіты граф. Оржэцкі і ў памешк. жыдоўскай студэнцкай арганізацыі.

У Літве закончыліся выбары да новага Сойму. Склад будучага Сойму будзе прыблізна гэтакі: народн. сацыялістых—15, сац.-дэмакр.—9, нацыян. меншасьці—14, блёк хр. дэм. 38, пажанга—2.

У Рыме адбыўся міжнародны Кангрэс Кабет. Беларускі Жаноцкі Камітэт у Коўні, за подпісам старшыні яго А. Пракулевіч, выслаў привітаньне Кангрэсу і пратэст проціў уціску над беларускімі кабетамі і дзецьмі, якім ня даюць вучыцца на роднай мове на акупаваных беларускіх землях.

У Гамбурзе (Нямеччына) адбываецца кангрэс сацыялістычных інтэрнацыянаў.

Англія. Бонар Луо вышаў у адстаўку. Старшынёў Міністраў назначаны Бальдвін, які быў міністрам фінансаў у кабінэце Б.—Лоу.

У Рурскім Басэйне сытуацыя абастраецца Рабочыя з прычыны дарагавізны разграбілі шмат складаў з прадуктамі. Беспарадкі прыймаюць вялікія разьмеры. Бадай усе рабочыя на ўсім абшары Рура аб'явілі забастоўку. Горад Гельшэнкірхэн знайходзіцца ў руках камуністаў. У часе барацьбы шмат забіта і ранена. На канале Ран-Гэрн узарваны шлюзы. Акупанты ўсімі сіламі стараюцца задушыць рабочы рух. У Дартмузе адбыліся хаўтуры забітых; у паходзе прынялі удзел дзесяткі тысяч рабочых у вайсковым шыху з чырвонымі штандарамі.

Гданск. У зьвязку з абастрэньнем адносін паміж Польшчай і Гданскам Гданская прэса непакоіцца прыездам у Гданск г. Жэлігоўскага, вядомага Вільні.

Адстаука Ластоускага.

Прадстаўнік Беларускай Народнай Рэспублікі у Літве п. Захарка апублікаваў у літоўскай прэсе камунікат гэткага зьместу.

„Старшыня міністраў беларускага ўраду В. Ластоўскі 20 красавіка г. г. падаў Старшыне Рады Бел. Нар Рэсп. П. Крэчэўскаму заяву аб выхадзе ў адстаўку па матывам асабістага характару Адстаўка прынята. Выпаўненьне абавязкоў галавы ўраду узложана на міністра заграцічных спраў А. Цьвікевіча. Згодна з канстытуцыйнымі пастановамі Рады Бел Нар. Рэсп., прэрэгатывы арганізацыі ўраду, да скліканьня яе чарговай сэсыі, належыць прэзыдыуму Рады Рэсп., каторы застаючамуся цяпер гасьцінасьцю Літвы.“

Бюджэт Польшчы на 1923 г.

Урад унёс у Сойм праект бюджэту на 1923 г. абличаны у залатых польскіх.

Бюджэт дзеліцца на тры часьці.

Адміністрацыйны бюджэт прадбача даход у 819,33 ,000 пол. зал, а выдатку 1,1-6,24 ,000 пол. залат.

На адно Міністэрства вайсковых спраў трапіцца 50 пр. усіх выдаткаў, прадбачаных у гэтым бюджэце.

На асьвету выдзеляецца толькі 155,506,000 поль. зал., што займае ўсяго адну пятую часьць выдаткаў на войска.

Для Міністэрства Працы і Грамадзкай Апекі прадбачыцца толькі 20,412,000 поль. зал., што ў адносінах да выдаткаў на ўзбраеньне дае толькі сарзкавую частку.

Трэба адзначыць, што ў 1922 годзе на войска ішло 25,6 працэнтаў усяго бюджэту, да ў гэтым годзе мае быць павялічана выдаткаў на войска да 50 працэнтаў.

Агулам бюджэт прадбача 990.148,000 зал. поль. даходу і 1.700.10 000 зал. поль. выдаткаў. Недахват выкажыцца у 710.252.000 зал. поль., што ў марках будзе нябывала вялікая цыфра 6.031142000000

Ясна, што пры сучасным гаспадарсім ладзе ўся цяжасьць гэтага недахвата узваліцца на плечы працоўнай масы.

Карэспандэнцыі.

Вайна пачалася.

Вось што нам пішуць з вёскі Грыневічы, Барахвянаўскай гміны, Вялейскага павету.

22 траўня г. г. калі наша вёска выгнала своё жывёлу на пашу свайго сэрвітуту, дык пабачыла, што на жывёлу зьвярнуўшы з гасьцінца; ішло ў баявым парадку конніца ў польскай форме, пры поўным узбраеньні з падыятымі голымі шаблямі. Двох афіцэраў наўзаводы ехала на перадзі.

Акружыўшы з усіх бакоў скаціну і пастухоў гэтае адважнае войска пачало бой. Ведама, што пабеда аказалася з боку войска, напрыяцель яго налічае такія страты: штук дзесяць параненых кароў і пабітыя да крыві пастухі. Але гэтаму не канец. Вяскоўцы, даведаўшыся аб бядзе, кінуліся ратаваць сваіх кароў, каб зрабіць ім перавязкі і лекарскую запамогу, але за гэтую сьмеласьць былі атакаваны войскам і з ахвярамі адагнаны ў вёску. Раненымі аказаліся: Капярына Станкевіч, Марцэля Капыш, Язэп Станкевіч, Янкр Война, Юстына Варэнка, Францішак Вараны, Язэп Стадальнік, Ганна Стадальнік, Францішак Юргевіч, Язэп Война, Пятрук Варэнка.

Як посьле высьнілась, дык напаўшае войска было II швадрон 4 палка Занеманскіх уланаў пад камандай ротмістра Гепэвіча, паручніка і ўпраўляючага маёнткам Перахвіянава панам Астравецкім.

Што пабіты сяляне, дык гэтым нас не задзівіш — не навіна, але пры чым тут жывёла пане ротмістр?!

Цярплівы нябошчык.

Мяст. Сужаны.

Чуў я недаўна, мае вы кветкі,
Сапраўды дзіўны выпадак гэткі.
Аб ём шырока ўсё казалі
Можа і праўда, як не салгалі.
Быць мела гэта, скажам вашэці
Ды ў Вялейскім негдзе павеце
Неяк зімою, мусі пад поўня,
Адзін там дзядзька памёр раптоўне.
У гэткіх справах трэ асьцярожна:
Такіх вось трупоў хаваць ня можна,
Бо судзьдзя, дохтар якбы на кепства
Мусяць у перад павесьці сьледзтва.
Дык хоць прыбралі па сьмерці гарне,
А палажылі толькі ў трупярні.
Гэтак ці чулі без амбарасу,
Як быць павінна, толькі да часу.
Пакуль да сьледзтва, то-ж няма жарту,
Дык у дадатку стаўлялі варту,
Але сказаўшы так, без галасу
Судзьдзя прыехаць ня меў ўсё часу.
Усё збіраўся туды прыехаць,
А наш нябошчык высах бы вехаць;
Толькі сьмярдзеці пачаў ён вельмі,
Покуль духоўнік прагнаў з трупельні.
Зноў тарапаты, ды варта сьмехаў,
Як той нябошчык дамоў прыехаў.
Клопат вялікі, дзе-ж яго дзеці,
Ну дык унесьлі зараз да клеці
І там да часу супачывае,
Да таго сьледзтва цярпліў чэкае
Яму такая знаць вышла карта;
Што днём і ночу пільнуе варта.
Хоць смурод душыць, сказаўшы ў перад,
А можа прыйдзе на следзтва черад,
Паўна-ж урэшце, як мне здаецца,
Можа няшчасны калі дажджецца. —
Гэтак сказаўшы проста, без звадкі
У нашым краю дрэнь, брат, парадкі.
Каб прыглядзецца толькі патросе
Пэўна і болей чаго знайшлося.

Стары Улас.

З Вільні.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада гэтым абвешчае, што калі пройдзе праз пленум Сойму пастанова аб белар. вучыцельскіх курсах і адкрыцьці вучыцельскай сэмінарыі. Школьная Рада паведаміць зацікаўленых у гэтай справе асоб праз газэты і сэкрэтарыяты белар пасольства клюбу

Канфіскаты газэты „Крыніса“. Па загаду камісара ураду м. Вільні канфіскована № 5 „Крыніцу“. Гэта першая канфіската на семым годзе жыцьця гэтай часопісі, якая перажывала родныя ўлады і розныя акупацыі.

Вышлі з друку і прадаюцца ў Беларускай кнігарні паштовыя пісулькі з партрэтамі Івана Луцкевіча.

Усячына.

Гнілы Захад.

За апошнія часы ў Англіі узьнялася эпідэмія самагубстваў сярод усіх слаёў вобчэства, асабліва-ж сярод вялікіх арыстакратычных семьяў. Хронікі газэт перапоўнены самымі небывалымі выпадкамі самагубстваў.

Недаўна ў Лёндане вядомая краля з вышэйшых кругоў вобчэства па прозьвішчу Лебо на 22 гаду жыцьця забіла свайго мужа, а пасьля выстралам у галаву пакончыла з сабой. Самагубка пражыла шчасьліва 4 гады з сваім мужам Яе нашлі няжывой у крэсьле з вянком жывых красак, у шлюбнай вопратцы. У пасьмертнай запісцы было напісано: „Лепш памерці пакуль каханьне яшчэ моцнае і маладое“.

Беларускае Грамадзянскае Сабраньне

з прычыны заканчэньня конкурсу, прапануе аўтарам, даваўшым на конкурс пьесы, забраць іх, а аўтарам: „**П. С. Х.**“, „**Жыцьце і каханьне**“ і „**Янка Канцавы**“, апрача таго і **прэміі.**

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ

мае на складзе і прадае гэткія кнігі:

Беларускі Дэкляматар.
Казкі жыцьця. Апавяданьні. *Я. Колас.*
Строма Вершы. *У. Дубоўка.*
Беларусь. Вершы. *Л. Родзевіч.*
П. С. Х. Фацэцыя ў 1 дзеі. *Сучаснага.*
Досьвіткі. Драматычныя сцэны. *Л. Родзевіча.*
Мутэрка. П'еса. *М. Гарэцкі.*
Сцэнічныя творы для дзіцячага тэатру.
Стася. Апавяданьне *Дзядзька Працук.*
Сурдут і сярмяга. П'еса.
Бярозка. Апавяданьні. *Ядвігін Ш.*
У Палескай Глушы. *Тарас Гушча.*
Хрыстаматыя белар. літар. *М. Гарэцкі.*
П'есы („Модны Шляхцюк“, „Староста“, „У кавалёвай хаце“). Сшытак № 1.
Сцэнічныя творы. *Л. Родзевіч.*
Беларусь у песьнях. *Я. Фарботка.*
Дыямэнты. Зборнік краснага пісьменства.
Шчасьлівы муж. Камэдыя. *Ф. Аляхновіч.*
Сьпявак Блондэль. Апавяданьне.
„Зборнік Беларускіх Ведамасьцей“ ст. № 1, 2 і 3.
Родны Край Чытанка для школ
Гістор бел. літэр.
Географія Беларусі.
Жыды на Беларусі. *З. Бядуля.*
Этнографічныя зборнікі Раманава.
Niadzielno Ewanhielii i Nawuki kniź. №№ I, II i III Ks. Dr. H. Bobicz.
Неба і зоры.
Закон жыцьця сярод жывел і расьлін.
Фізыка. *Трэпка.*
Беларусь. Др. *А. Цьвікевіч*
Становішча белар. школы у Латвіі.
Элемэнтарная алгебра ч II.
Мэтрычная сыстэма мераў
Правапіс чужых слоў. *Я. Станкевіч.*
Асноўныя тэрміны з геамэтрыі.
Biełaruskija lekarskija ziołki. Dr. Kraskouski.
Пісулькі з беларускімі відавокамі.
Партрэты беларускіх пісьменьнікаў і дзеячоў

Адрас кнігарні: *Вільня, Завальная. 7.*

Рэдактар-выдавец Прохараў. Друкарня Дворжэца, Завальная 32.